АКТУАЛЬНА

## ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ІНТАРЭСЫ ЛЮДЗЕЙ

**Члены пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Савета Рэспублікі паставілі свае подпісы пад зваротам арганізацыі ў абарону справядлівых адносін да беларускага народа.**

Больш за 50 тысяч беларускіх жанчын паставіла свае подпісы пад зваротам БСЖ да жаночых арганізацый свету супраць увядзення санкцый у дачыненні да Беларусі.

Беларускі саюз жанчын з трывогай і абурэннем успрымае няспынны палітычны і эканамічны ціск на Беларусь. Жанчыны як ніхто іншы разумеюць, чым могуць абярнуцца рознага кшталту санкцыі супраць нашай краіны. Яны ў першую чаргу пацягнуць зніжэнне дабрабыту людзей, кожнага з грамадзян нашай краіны.

— Каб дагадзіць геапалітычным інтарэсам, не зважаючы на міжнароднае права, нас, нашы сем'і спрабуюць заціснуць у эканамічныя ціскі, тым самым гвалтоўна ўкараняючы іншы шлях развіцця, — гаворыцца ў звароце. — Больш за 25 гадоў таму мы абралі курс на пабудову суверэннай Беларусі як сацыяльна арыентаванай справядлівай дзяржавы, дзе галоўная каштоўнасць — інтарэсы людзей. Такі выбар пацверджаны большасцю беларусаў і ў 2020 годзе на выбарах кіраўніка дзяржавы. Мы патрабуем пачуць голас нас, жанчын, якія жывуць у Беларусі і штодзённа сваёй працай развіваюць сваю краіну. Наш праўдзівы голас — гэта голас нашых дзяцей, чыю будучыню мы гатовыя адстойваць і абараняць. Пачуйце голас розуму! Пачуйце голас сумлення! У вас таксама ёсць сем'і і дзеці. Мы не просім ласкі. Мы проста хочам спакойна жыць і працаваць у сваёй краіне пад сваім сцягам і па сваіх законах. Любыя спробы ціску на Беларусь бесперспектыўныя. Яны яшчэ больш аб'ядноўваюць нас і робяць нас толькі мацнейшымі. Мы выстаім. Сваёй працай, нашай гісторыяй, міралюбівай і адкрытай палітыкай мы заслужылі права жыць у міры, павазе і добрасуседстве. Звяртаемся да ўсіх жаночых арганізацый свету і просім аддаць голас у падтрымку справядлівых адносін да беларускага народа, бо тое, што сёння спрабуюць зрабіць з нашай краінай, заўтра можа закрануць і вас.



Беларускія жанчыны звярнуліся да жанчын свету, да сусветнай супольнасці па падтрымку мірных памкненняў беларусаў.

Зварот беларускіх жанчын будзе накіраваны ў Арганізацыю Аб'яднаных Нацый.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента, свае подпісы пад заклікам паставілі і члены пярвічнай арганізацыі БСЖ Сакратарыята Савета Рэспублікі.

МЕРКАВАННЕ

**Сяргей СІВЕЦ:**

## Новыя выклікі патрабуюць маштабнага прававога рэагавання

**Такую думку старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ выказаў на ток-шоу "Па сутнасці" на тэлеканале СТБ.**



— Санкцыі будуць, і эканамічны ціск будзе. Мы, вядома, павінны гэтаму супрацьстаяць, у тым ліку і з пункту гледжання права. Сёння ўжо ёсць артыкул 361 Крымінальнага кодэкса — заклік да здзяйснення дзеянняў, якія наносяць шкоду нацыянальнай бяспецы. Але гэта фармальны артыкул. Адназначна яго трэба мяняць, нават у рамках ініцыятывы «Круглага стала», — адзначыў сенатар і звярнуў увагу на наступнае. — Экстрэмізм — гэта дрэнна. Тэрарызм — гэта наогул за межамі. Але таго інструментарыю, які ўжо ёсць сёння, нам цалкам хопіць, каб з гэтымі з'явамі справіцца. І мы справімся, у нас невялікая краіна, мы іх ужо фактычна ўсіх ведаем. Але гэтыя глабальныя выклікі, пагрозы, якія сёння людзі атрымліваюць у Белым доме і пра якія мы пакуль не ведаем, але з якімі абавязкова сутыкнёмся, патрабуюць больш шырокага і маштабнага прававога рэагавання праз новую рэдакцыю Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

Сяргей Сівец перакананы, што Ціханоўская гаворыць вуснамі Дзяржпэпартамента ЗША, і мы павінны выразна гэта разумець. На ток-шоу ён нагадаў аб ролі так званых лідараў апазіцыі:

— Калі ў жніўні мінулага года хацелі краіну ўзяць на маршы з наскоку, і гэта не атрымалася, то сёння зашмальцаваныя шарпаўскія метадычкі ўжо сыдуць ва ўтыль. Цяпер будзе зусім іншая гісторыя, будуць распрацоўвацца іншыя метадычкі ў рамках працягу гэтай усёй кампаніі. І інструментамі будуць тыя асобы, якія атрымліваюць сёння інструкцыі ў Белым доме і Дзярждэпартаменце.

Таксама старшыня профільнай камісіі перакананы, што Святлана Ціханоўская павінна атрымаць статус ворага народа.

— У дзеяннях Ціханоўскай ужо цяпер ёсць аб'ектыўны бок саставу злачынства — здрада Радзіме. Яна грамадзянка Рэспублікі Беларусь, і тыя дзеянні, да якіх яна заклікае, — гэта і ёсць здрада Радзіме. А плюс яшчэ змова з мэтай гвалтоўнага захопу ўлады, што мы мелі на ўвазе, у жніўні, бачылі ўсё. Там ужо цэлая гронка саставаў злачынстваў, — паведаміў у эфіры сенатар.

Аднак каб прыцягнуць яе да адказу, гэтага сёння недастаткова, бо дэ-факта — міжнароднае права памерла, лічыць ён.

— Усе тыя практычныя прыклады, якія паказваюць, што нягледзячы на ўніверсальныя міжнародныя прававыя акты, нягледзячы на Статут ААН, на тое, што дзяржавы ўзялі на сябе абавязацельствы сумесна процідзейнічаць падобнага роду дэструктыўным тэрарыстычным пагрозам, шэраг дзяржаў лічыць, што ў іх ёсць свае стаўленне да падобных рэчаў, і яны маюць права ігнараваць міжнародныя прававыя нормы, — падкрэсліў Сяргей Сівец.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

**Сяргей РАЧКОЎ:**

## Літве выгадная палітызацыя міграцыйнай праблематыкі

**Гэта дае ёй магчымасць атрымаць дадатковыя дывідэнды і фінансаванне. Такое меркаванне ў ток-шоу "Па сутнасці" на тэлеканале СТБ выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**



— Наша краіна з'яўляецца членам канвенцыі аб бежанцах, удзельнічае ў многіх міжнародных пагадненнях, не парушаючы іх нормаў. Мы вельмі шмат зрабілі для Еўропы па ўмацаванні мяжы і яе абароне ад незаконнай міграцыі. У нейкі перыяд еўрапейцы гэта ў цэлым станоўча ацэньвалі. Яны разумелі, што беларусы сапраўды зробяць сваю работу, — цытуе сенатара БелТА. — У цяперашні час яны спынілі рэалізацыю шэрагу праектаў, увялі санкцыі. Чаму мы павінны больш клапаціцца пра іх, чым яны клапоцяцца пра сябе? Гэта лагічнае пытанне. У нашай краіне пражывае каля 120 тысяч замежных грамадзян у розным статусе, і кожны год мы з многімі (дзесьці каля дзвюх-трох тысяч) таксама маем пэўныя праблемы. Мы вымушаныя іх ці выхоўваць, ці дэпартаваць, што таксама вядзе да вельмі сур'ёзных выдаткаў. Таму цяпер мы будзем траціць больш уласных сродкаў, сродкаў нашых падаткаплацельшчыкаў, на ўнутраную бяспеку, грамадскую бяспеку.

Старшыня профільнай камісіі перакананы, што Літве выгадная палітызацыя міграцыйнай праблематыкі, каб атрымаць дадатковыя дывідэнды і фінансаванне.

— Пакуль тыя лічбы, якія агучваюць яны, і тыя лічбы, якія ёсць у беларускага боку, не сведчаць аб міграцыйным крызісе, калапсе і гэтак далей. Гэта палітызацыя, імкненне захаваць беларускую тэму ў іх парадку дня. Я хачу падкрэсліць, што наша пагранічная служба дзейнічае вельмі прафесіянальна. За палову гэтага года нашы пагранічнікі затрымалі амаль у пяць разоў больш незаконных мігрантаў, чым за 2020 год. У той жа час у нас ёсць праблемы на літоўскім участку нашай граніцы: мы затрымалі амаль у восем разоў больш наркотыкаў, чым за папярэднія тры гады, — падкрэсліў сенатар.

МЕРКАВАННЕ

**Кацярына СЕРАФІНОВІЧ:**

## Бумеранг з метадамі фашысцкіх карнікаў

**Літва запусціла бумеранг, ужыўшы для вырашэння наспелага канфлікту метады фашысцкіх карнікаў. Такім меркаваннем падзялілася член Савета Рэспублікі Кацярына Серафіновіч.**

— Літва ў роспачы. Не гатовая была краіна-суседка да напльву мігрантаў. І да гэтага тут не асабліва цырымоніліся з бежанцамі — пабудавалі для іх палатачны лагер і па ўжо існуючай традыцыі пачалі вінаваціць ва ўсіх сваіх бедах Беларусь. Гэта, маўляў, беларускія ўлады і пагранічная служба вінаватыя ў літоўскіх праблемах, гэта яны не затрымліваюць мігрантаў, якія імкнуцца трапіць у Еўропу, якая, дарэчы, абяцала ім дапамогу і іншыя выгады. А Беларусь ва ўмовах санкцыйнага ціску павінна забяспечваць бяспеку літоўскіх граніц за свой кошт? — прыводзіць меркаванне сенатара БелТА. — І мігрантаў вінаваціць няма за што: яны бягуць са спустошаных грамадзянскімі войнамі краін, ад голаду, беспрацоўя, бягуць з надзеяй на дапамогу і з марай на лепшае жыццё для сваіх дзяцей. На жаль, даводзіцца канстатаваць: Літва не справілася з сітуацыяй нават як перавалачны пункт для далейшага правядзення мігрантаў у краіны Еўропы. І тое вырашэнне наспелай праблемы, якое літоўцы прадэманстравалі ўсяму свету, беспрэцэдэнтнае па сваім цынізме.

Кацярына Серафіновіч нагадала, што амаль тры дзясяткі іракскіх нелегалаў (дзяцей, жанчын, сярод іх цяжарная) збівалі, не давалі ежы і вады, а ў выніку прывезлі на граніцу і прымусілі бегчы на беларускі бок, страляючы ўслед.

— Удумаемся: XXI стагоддзе, апісаная сітуацыя адбываецца ў краіне, якая пафасна называе сябе еўрапейскай! Як такое магчыма?! Ёсць у тым, што адбываецца адно «але». Яно заключаецца ў менталітэце арабскага народа. Ва ўсходнім свеце беражліва ставяцца да сваіх жанчын, іх абарона — справа гонару мужчын. Праличыліся літоўскія ўлады: адна справа — гадамі ствараць інфашум вакол Беларусі з нагоды АЭС, выдаваць фэйкі з розных прычын, іншая — страляць у мусульманскіх жанчын, іх дзяцей. Ёсць такі выраз: калі вы не верыце ў бумеранг, значыць, ён яшчэ да вас не даляцеў. Літва запусціла гэты бумеранг, ужыўшы для вырашэння наспелага канфлікту метады фашысцкіх карнікаў. Або ёсць мова дыпламатыі — Беларусь, нягледзячы на ўсе ціскі звонку, застаецца міралюбнай і адкрытай краінай, — падкрэсліла сенатар.



Паводле яе слоў, іракскіх мігрантаў, збітых і запалоханых, у Беларусі прынялі, забяспечылі ўсім неабходным, уключаючы медыцынскую дапамогу цяжарнай жанчыне.

— Краіна, якую абвінавачваюць у адсутнасці дэмакратычных правоў і свабод, дэманструе свету клопат пра людзей незалежна ад іх нацыянальнасці і веравызнання. Краіна, якая гучна крычыць аб сваёй дэмакратычнасці, распраўляецца з гэтымі людзьмі жорстка і беспрынцыпова... Праўда, цяпер маўчыць пра тое, чаму стаў магчымы такі інцыдэнт. Зразумела, Літва ў адчаі, аднак гэта не падстава вырашаць канфлікт з дапамогай нацысцкіх метадаў. Мабыць, літоўскія ўлады лічаць па-іншаму, — рэзюмавала Кацярына Серафіновіч.